Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2014-03-21

# Слова да слова

**Галерэя «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі зноў парадавала цікавай і безумоўна вартай увагі прэзентацыяй: публіцы прадставілі фундаментальныя даведачныя выданні па беларускай мове.**

Госці мерапрыемства пазнаёміліся са «Слоўнікам беларускай мовы», «Граматычным слоўнікам дзеяслова», «Граматычным слоўнікам назоўніка», «Граматычным слоўнікам прыметніка, займенніка, лічэбніка, прыслоўя». Пра тры апошнія мы пісалі раней падрабязна. Над выданнямі працавалі навукоўцы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Алена Даўгаполава, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі, адзначыла, што сустрэча гэтая заканамерная: беларуская мова, як і ўсякая іншая, развіваецца, назапашвае лексіку, змяняецца, так што слоўнікі рана ці позна мусілі з'явіцца. Добра, што гэта здарылася раней.

Акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр Каваленя павіншаваў навуковы калектыў і дадаў, што праца гэтая бачыцца яму следаваннем запавету, які пакінуў нам Францішак Багушэвіч: «Не пакідайце мовы нашай...»

Усе выступоўцы падкрэслівалі вялікую значнасць выданняў. Так, яны мусяць садзейнічаць павышэнню культуры беларускай пісьмовай мовы, вывучэнню мовы ў школах і ВНУ, а таксама, як пазначалася ў анонсе мерапрыемства, «забеспячэнню статусу беларускай мовы як дзяржаўнай мовы краіны, павышэнню яе прэстыжу як высокаразвітой літаратурнай мовы, якая можа абслугоўваць усе камунікатыўныя патрэбы сучаснага беларускага грамадства».



*Выступае Валянціна Русак.*

Я цытую гэтыя словы, каб расставіць акцэнты. Людзям, якія сапраўды ведаюць мову і жывуць з ёю, і так вядома, што яна «высокаразвітая» і г. д. Значыць, перадусім выказванне адносіцца да рускамоўных людзей, а таксама навучэнцаў, якія толькі складаюць уяўленні пра свет, толькі пачынаюць вылучаць для сябе пэўныя каштоўнасці. Значыць, слоўнікі павінны займець самае шырокае распаўсюджанне. Іх трэба развезці па ўсіх без выключэння навучальных установах, па ўсіх адміністрацыйных «пастах». Слоўнікамі мусяць карыстацца перадусім настаўнікі, з якіх бяруць прыклад дзеці. Што яшчэ важна — слоўнікі варта было б распаўсюджваць альбо зусім бясплатна, альбо са зніжкай.

Пра тое ж казалі навукоўцы: Аляксандр Лукашанец, які зладзіў своеасаблівую лекцыю па моваведству, Валянціна Русак, Ігар Капылоў, а таксама галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская навука» Георгій Кісялёў.

Падчас прэзентацыі працавала кніжная выстаўка «Слова да слова — будзе мова», якая змясціла больш як сто арфаграфічных, тлумачальных, дыялектычных і іншых слоўнікаў розных гадоў выдання пачынаючы ад XIX стагоддзя.

**Анастасія ГРЫШЧУК,**
**фота прадастаўлена Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі**

Анастасія Грышчук. Слова да слова